Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

14 ЛЮТАГА 2014 г. ПЯТНІЦА № 28 (27638) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Медыйныя асобы адпачываюць… на працы!

СТАР.3

Праграма тэлебачання на наступны тыдзень

20 КАНАЛАЎ

Асаблівасці «алімпійскага» быту

СТАР.8

■ З першых вуснаў

ГРОШЫ АТРЫМАЕ ТОЛЬКІ ТОЙ, ХТО ЭФЕКТЫЎНА ПРАЦУЕ

Чаму кіраўнік Банка развіцця параўноўвае ўзровень працэнтных ставак з хваробай?

Падтрымаць айчынны экспарт. Дапамагчы малому і сярэдняму бізнесу. Прафінансаваць шэраг буйных праектаў. Гэта прыкладны спіс планаў Банка развіцця на 2014 год. Падрабязней пра ўсё гэта днямі расказаў старшыня праўлення банка Сяргей РУМАС.

Новая схема

Паводле яго слоў, Банк развіцця з 2015 года пачне выконваць функцыі каардынатара пры фінансаванні дзяржпраграм. «На наш погляд, паўнавартаснае, а галоўнае, эфектыўнае выкананне гэтай функцыі павінна суправаджацца пераглядам падыходаў да фінансавання дзяржпраграм», — падкрэсліў Сяргей Румас. Банк прапануе наступнае. Ва ўмовах абмежаванасці ў краіне рэсурсных магчымасцяў вызначаюцца галіны, якія з'яўляюцца прыярытэтнымі для яе развіцця. Для кожнай галіны вызначаецца колькасць аб'ектаў, якія трэба пабудаваць альбо мадэрнізаваць, каб забяспечыць выкананне якасных параметраў развіцця галіны. Далей Банк развіцця праводзіць конкурс, адбірае самыя эфектыўныя з наяўных бізнес-планаў і ажыццяўляе іх фінансаванне. «Пры рэалізацыі такой схемы планавання дзяржпраграм Банк развіцця выступае ў якасці незалежнага эксперта, а асноўным крытэрыем рэалізацыі праектаў становіцца іх эфектыўнасць», — адзначыў Сяргей Румас.

Між іншым, па даручэнні прэм'ер-міністра Банк развіцця сумесна з Мінэканомікі і Мінфінам выпрацоўваюць план фінансавання дзяржпраграм на 2014 год. У ім на сістэмнай аснове будуць адлюстраваны пытанні фінансавання раней пачатых праектаў і новапачатых — з 2014 года. «Асаблівасцю гэтага плана стане зацвярджэнне вычарпальнага пераліку праектаў і фіксаваныя сумы фінансавання кожнага з іх. Тым самым мы павысім празрыстасць і эфектыўнасць рэалізацыі дзяржпраграм», — упэўнены Сяргей Румас. Чакаецца, што план вельмі хутка будзе зацверджаны урадам і Нацбанкам.

Як панізіць стаўкі?

«Ці трэба зніжаць сёння працэнтныя стаўкі? Вядома, трэба, — лічыць Сяргей Румас. — Але, па-першае, Нацыянальны банк як рэгулятар не можа гэта зрабіць адміністрацыйна, і вы бачыце, што сёння стаўка рэфінансавання як арыенцір працэнтных ставак не працуе. А па-другое, эфект ад зніжэння працэнтных ставак будзе толькі ў тым выпадку, калі само зніжэнне будзе падмацавана іншымі захадамі эканамічнай палітыкі, таму што сама па сабе даступнасць крэдытаў павысіць інфляцыйныя чаканні і будзе спрыяць росту імпарту». Кіраўнік Банка развіцця патлумачыў сваю пазіцыю: высокія працэнтныя стаўкі, якія ўсталяваліся ў 2011 годзе, былі ахоўнай рэакцыяй эканомікі на ліквідацыю назапашаных дысбалансаў, у першую чаргу звязаных з усталяваннем рэальнага абменнага курсу беларускага рубля. «Гэта было абсалютна нармальнай сітуацыяй для 2011 і 2012 гадоў, затым працэнтныя стаўкі, як чакалі ва ўрадзе, павінны былі знізіцца. Па аналогіі з тым, як чалавек рэагуе на хваробу: спачатку тэмпература вырастае да максімальнай, а потым, па меры таго, як адбываецца лячэнне, вяртаецца ў норму». Чаму гэтага не адбылося? Па шэрагу прычын: і неспрыяльная знешняя кан'юнктура ў гэты перыяд, і пытанні па канкурэнтаздольнасці айчыннай прадукцыі, і, вядома, павялічаныя з сярэдзіны 2012 года аб'ёмы фінансавання дзяржаўных праграм. Сяргей Румас бачыць праблему ў тым, што працэнтная стаўка па дзяржпраграмах субсідуецца дзяржавай, і пазычальніку, у прынцыпе, няма розніцы, які ўзровень працэнтнай стаўкі: «Попыт на такія крэдыты нараджаў прапановы, банкі прыцягвалі рэсурсы, па сутнасці, па любой цане, укладваючы у дзяржпраграмы, нагрузку па якіх у канчатковым выніку нёс дзяржаўны бюджэт».

СТАР.2

■ Фінансы

ФІЛАСОФІЯ ЎЗАЕМАДАПАМОГІ

ХОЧАШ ПАЗЫЧЫЦЬ ГРОШАЙ? НЕ ЗАБУДЗЬ ПРА АДКАЗНАСЦЬ

Мікрафінансаванне ўвайшло ў наша жыццё імкліва і незаўважна. Мы больш не здзіўляемся паўсюднай рэкламе «пазыкі да зарплаты» і да таго падобнага. Мала таго, праз пэўны час Нацыянальны банк будзе кантраляваць гэты сегмент фінансавага рынку і сачыць за добрасумленнай працай мікрафінансавых арганізацый. У той жа час у многіх няма правільнага разумення, што сабою ўяўляюць «канторы», якія прыходзяць нам на дапамогу ў грашова цяжкія часіны. Насамрэч яны падзяляюцца на два вялікія лагеры: камерцыйныя і некамерцыйныя арганізацыі. У чым розніца паміж імі? Пра што трэба ведаць, калі ўступаеш у крэдытны кааператыў? Пра гэта распавядае Алена Каляда, старшыня праўлення Рэспубліканскай асацыяцыі спажывецкіх кааператываў фінансавай узаемадапамогі (РАФУ).

Віды МФА

Пачнём з таго, што сістэма мікрафінансавых арганізацый выглядае наступным чынам: «Адна галіна — камерцыйныя мікрафінансавыя арганізацыі, якія сёння вельмі актыўна працуюць, прапаноўваючы хуткія пазыкі. Другая — некамерцыйныя арганізацыі, або крэдытныя кааператывы, — тлумачыць Алена Каляда. — Апошнія, у сваю чаргу, можна падзяліць на некалькі катэгорый: 1) кааператывы для грамадзян (па сутнасці, аб'яднанне людзей з пэўнай мэтай — задавальненне сваіх фінансавых патрэб; удзельнікамі могуць быць толькі грамадзяне); 2) таварыствы ўзаемнага крэдытавання (кааператывы для суб'ектаў прадпрымальніцтва); 3) змешаныя кааператывы, якія аб'ядноўваюць як юрыдычных, так і фізічных асоб; 4) аб'яднанні другога ўзроўню, куды ўваходзяць толькі кааператывы, і служаць для пераразмеркавання ліквіднасці менавіта паміж імі, калі гэта патрэбна». Сёння РАФУ аб'ядноўвае ўсе віды кааператываў. «Між іншым, неўзабаве наша асацыяцыя будзе аб'ядноўваць і камерцыйныя арганізацыі. Праўда, не ўсе кааператывы былі за гэтае рашэнне. Многія лічаць, што ў кааператываў ёсць галоўнае адрозненне — іх даходы не размяркоўваюцца паміж удзельнікамі, няма генеральнага заснавальніка, які забірае сабе прыбытак. Грошы застаюцца ў агульным карыстанні і ідуць на патрэбы або ўсяго кааператыва, або яго членаў. Тут прысутнічае філасофія ўзаемадапамогі. У камерцыйных арганізацыях такога няма».

Сама спадарыня Алена бачыць перспектыву ў развіцці менавіта некамерцыйных МФА. «Сёння больш чым у сотні краін свету існуе сістэма некамерцыйных крэдытных кааператываў. Ёсць нават Сусветны савет крэдытных саюзаў. Ведаеце, 44–45% фінансавага абароту ЗША — у крэдытных кааператывах. Калі мы былі ў Амерыцы, першае месца, куды нас павялі, — гэта крэдытны саюз Дэпартамента ЗША. Там любая дзяржустанова, якая сябе паважае, мае свой крэдытны кааператыў».

СТАР.2



НА СКРЫЖАВАННІ СВЯТОГА ВАЛЯНЦІНА

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЦЫТАТА ДНЯ

Вадзім ЁСУБ, фінансавы аналітык:

«Я думаю, што паўтараць прыклад Казахстана і Украіны, дзе адважыліся на разавую і значную дэвальвацыю, не варта. Хутчэй за ўсё, у якасці прыкладу можна пайсці па шляху Расіі. Адметнай асаблівасцю расійскага рынку з'яўляецца тое, што там існуе так званае аўтаматычнае правіла, калі змяненне попыту і прапановы на валюту прыводзіць да таго, што ў загадзя вядомых аб'ёмах адбываюцца інтэрвенцыя з боку расійскага Цэнтрабанка і зрушэнне валютнага калідора. Нацыянальнаму банку Беларусі было б таксама мэтазгодна распрацаваць падобнае аўтаматычнае правіла».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 14.02.2014 г.

Долар ЗША	9700,00	▲
Еўра	13220,00	▲
Рас. руб.	278,50	▼
Укр. грыўня	1111,75	▲

У 10-Ы КЛАС — ПРАЗ КОНКУРС

ПРАЗ ДВА ГАДЫ Ў ШКОЛЕ МОГУЦЬ УКАРАНІЦЬ НЕЗАЛЕЖНУЮ АТЭСТАЦЫЮ

Ці можна якасць адукацыі вымяраць перамогамі беларускіх школьнікаў на міжнародных алімпіядах і інтэлектуальных турнірах? Калі абапірацца толькі на гэты паказчык, то беларуская школа працуе проста выдатна: вось і мінулым летам лепшыя вучні (а іншых на спаборніцтвы не адпраўляюць) заваявалі на міжнародных прадметных алімпіядах 26 медалёў: 3 залатыя, 12 сярэбраных і 11 бронзавых. Затое вынікі ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання падстаў для самазаспакаення не даюць — наадварот, прымушаюць задумацца над эфектыўнасцю работы школы.

— Самыя высокія вынікі на ЦТ дэманструюць школьнікі Мінска і Гродзенскай вобласці. А самыя нізкія паказчыкі (ніжэйшыя за агульнарэспубліканскія па ўсіх прадметах, акрамя нямецкай мовы) — у школьнікаў Брэсцкай вобласці. Прычым гэта ўжо шматгадовая тэндэнцыя, — падкрэсліў у сваім выступленні на выніковай калегіі **міністр адукацыі Сяргей МАСКЕВІЧ.** — У Топ-10 устаноў адукацыі па выніках ЦТ 2013 года ўвайшло па 3 установы адукацыі з Гомельскай вобласці і Мінска і па адной установе з Гродзенскай, Мінскай і Магілёўскай абласцей. Найлепшы паказчык — у Ліцэя БДУ, выпускнікі якога на ЦТ прадэманстравалі самыя высокія вынікі па 8 з 9 намінаваных прадметаў. Па рускай мове лепшы ў краіне вынік паказалі выпускнікі гімназіі № 1 горада Ліды. Хацеў бы звярнуць увагу, што ў спісе 100 лепшых (бралася па 10 лепшых у кожным прадмеце) ёсць установы адукацыі з усіх абласцей і Мінска, але сярод іх — гімназіі, ліцэі і толькі адна школа. Сярэдняя школа № 12 горада Пінска ўварвалася ў Топ лепшых з вынікамі выпускнікоў па беларускай мове. Добра вядома, што высокіх вынікаў дасягаюць навучэнцы тых школ, дзе працуюць вельмі прафесійныя педагогі.

СТАР.2

■ Надвор'е

АМАЛЬ ВЯСНА

У выхадныя чакаецца да 8 цяпла

Гэтымі днямі на тэрыторыю Беларусі працягнуць паступаць больш цёплыя паветраныя масы з боку Атлантыкі, паведаміла спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.

Таму ў пятніцу прагназуюцца невялікія ападкі (мокры снег і дождж). Максімальная тэмпература паветра ўдзень будзе вагацца ад 0 да плюс 5 градусаў. Мокры снег і дождж будуць ісці месцамі і ў суботу. Тэмпература паветра ўначы на 15 лютага складзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў, удзень — 2-7 цяпла. Увогуле без ападкаў будзе ўначы на нядзелю, а вось раніцай і ўдзень у заходніх і цэнтральных раёнах Беларусі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах будзе туман і слабы галалёд, на дарогах галалёдзіца. Тэмпература паветра ўначы на нядзелю стане ад мінус 4 да плюс 2 градусаў, па паўночным усходзе пахаладае да 6 марозу. Удзень чакаюцца даволі камфортныя плюс 2-8 градусаў.

У пачатку наступнага тыдня захаваецца не па сезоне цёплае надвор'е, калі ў панядзелак уначы будзе ад мінус 3 да плюс 2 градусаў, а ўдзень — 3-8 цяпла.

Сяргей КУРКАЧ.

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

РАСІЯ ЎВЯЛА АБМЕЖАВАННІ НА ЎСЫНАЎЛЕННЕ ДЗЯЦЕЙ У КРАІНЫ З АДНАПОЛЫМІ ШЛЮБАМІ

Прэм'ер РФ Дзмітрый Мядзведзеў падпісаў пастанову аб абмежаванні ўсынаўлення дзяцей у краіны з аднаполымі шлюбамі. «Усынавіцелямі могуць быць паўналетнія асобы абодвух палоў, за выключэннем асоб, якія знаходзяцца ў саюзе, заключаным паміж асобамі аднаго полу, прызнаным шлюбам і зарэгістраваным у адпаведнасці з заканадаўствам дзяржавы, у якой такі шлюб дазволены, а таксама асоб, якія з'яўляюцца грамадзянамі названай дзяржавы і не знаходзяцца ў шлюбе», — гаворыцца ў дакуменце, апублікаваным на сайце ўрада.

ПРАЗ НЕПАГАДЗЬ У ЗША ЗАГІНУЛІ 11 ЧАЛАВЕК

Адзінаццаць чалавек загінулі ў ДТЗ, выкліканых дрэннымі ўмовамі надвор'я на поўдні і паўднёвым усходзе ЗША, перадаюць інфармагенцтвы. Наймацнейшы снежны шторм ізноў абрынуўся на паўднёвыя штаты. Тут без электраэнергіі засталося больш за паўмільёна будынкаў. З-за непагадзі адменена звыш 3,3 тыс. авіярэйсаў. На дарогах у выніку дажджоў і моцных снегападаў утварылася тоўстая скарынка лёду. Нязвыклае пахаладанне прыводзіць да абледзянення ствалоў дрэў, якія з-за наледзі падаюць, раздзіраючы лініі электраперадачы.

БУЙНОЕ ГАЗАВАЕ РАДОВІШЧА ВЫЯЎЛЕНА НА ПОЎДНІ ПОЛЬШЧЫ

Нафтагазавы канцэрн PGNiG выявіў буйное газавае радовішча на поўдні Польшчы, перадаюць інфармагенцтвы. Радовішча газу выяўлена ў Падкарпацкім ваяводстве на мяжы са Славакіяй і Украінай. Запасы газу ацэньваюцца ў некалькі мільярдаў кубаметраў. Здабычу газу канцэрн плануе пачаць у другой палове 2015 года. Згодна з папярэднімі прагнозамі, у першы год эксплуатацыі здабыча будзе складаць 100 тыс. куб.м за суткі. Да 2020 года Польшча плануе стаць незалежнай ад паставак прыроднага газу з Расіі.

ISSN 1990 - 763X

9 771990 763008 14028>

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

ПРАЗМЕРНАСЦЬ СНУ НЕ МЕНШ НЕБЯСПЕЧНАЯ, ЧЫМ ЯГО НЕДАХОП



Пра шкоду недахопу сну ўрачы кажуць пастаянна. Вядома, што недасыпанне выліваецца ў вялікую колькасць праблем са здароўем. Але і празмерны сон небяспечны, піша The Times of India. Паводле слоў спецыялістаў, чалавек пераспаў, калі ён адчувае прыліў дрымотнасці і стомленасці ўдзень, уключаючы сітуацыі, калі чалавек засынае на працы або за рулём, нават калі шмат спаў ноччу. Да сімптомаў належаць таксама перапады настрою, павышаная раздражняльнасць, немагчымасць сканцэнтравацца. Нярэдка гэтыя праблемы выяўляюцца ў людзей з атлусценнем або з абструктыўным апноэ сну. Пры гэтым празмерна працяглы сон пагражае наборам вагі, як і недахоп сну; гіпертаніяй, узрастаннем рызыкі няшчасных выпадкаў. Медыкам вядомы феномен павышанай дрымотнасці, выкліканы прыёмам лекаў, неадэкватнай колькасцю гадзін сну, пазменнай працай, растройствамі сну і псіхалагічнымі праблемамі.

КОРАТКА

Дадатковы цягнік зносінамі Гомель — Мінск будзе курсіраваць па нядзелях з 16 лютага. Гэтае рашэнне прынята ў сувязі з вялікім пасажырапатокам у напрамку Гомель — Мінск.

У Беларусі вучоную ступень за 2012 год атрымалі 25 замежных грамадзян з 10 дзяржаў, а ў 2013 годзе — 46 замежных грамадзян з 11 дзяржаў.

Дырэкцыя па правядзенні чэмпіянату свету па хакеі інфармуе, што ў продажы з'явіліся білеты на шэраг матчаў хакейнага форуму. У прыватнасці, на чвэрцьфіналы, паўфіналы і матч за бронзавыя медалі. Акрамя таго, ёсць білеты і на гульні з удзелам зборных Беларусі, Расіі, Канады.

Міністэрства адукацыі Беларусі рыхтуе пералік адукацыйных экскурсій, рэкамендаваных для школьнікаў.

■ Урокі трагедыі

«ГЭТА БЫЛО, ЯК У НЕЙКІМ ЖАХЛІВЫМ ФІЛЬМЕ, ДЗЕ ЎСЁ РАЗБУРАЕЦЦА»...

У Краснаполлі ўшанавалі памяць настаўніка і 3 вучняў, якія загінулі 10 гадоў таму

…Той дзень скалануў спакойнае жыццё маленькага райцэнтра. Вестка аб тым, што ў спартыўнай зале мясцовай школы № 1 абрынуўся дах, разнеслася імгненна. Цішыню правінцыйнага горада ўзрушыла пранізлівае выццё выратавальных машын і «хуткай дапамогі». З усіх бакоў да школы беглі людзі. У адно імгненне тут сабралася, здаецца, усё Краснаполле. Настаўнікі яшчэ да прыбыцця аператыўных службаў вывелі вучняў на бяспечную адлегласць ад будынка. Акрамя таго, што на момант трагедыі ў спартзале знаходзіліся адначасова два дзясятыя класы, спачатку нічога не было вядома. І бацькі дзяцей, якія апынуліся пад заваламі, да апошняга спадзяваліся на лепшае. Нават тады, калі гэтай надзеі амаль не заставалася…

Усё здарылася 10 гадоў таму, 27 студзеня. Той дзень стаў апошнім у жыцці настаўніка фізкультуры Пятра Любашэнкі і вучняў Віці Баброва, Сашы Прусава і Ганны Акіньшавай. Час лечыць, але калі ішла на сустрэчу з відавочцамі тых падзей, адчувала: будзе балюча.

— Хіба такое можна выкрасліць з жыцця?! — цяжка ўздыхае дырэктар Краснапольскай гімназіі (гэты статус школа атрымала 7 гадоў таму) Алена Маскалёва. — Тыя, хто тады хадзіў у першы клас, цяпер адзінаццацікласнікі. Сёлета яны пакінуць сцены нашай установы. Для ўсіх астатніх гэта — ужо гісторыя. Але тое, што здарылася, забыць нельга.

СТАР.6

Пра тую трагедыю нагадваюць асабістыя рэчы загінулых.